*Алег Хаменка*

## САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ ЗМЕНЫ СВЯТКАВАННЯ КУПАЛЛЯ І РУСАЛЛЯ

Магчыма ўпэунена сцьвярджаць, што час, дакладныя даты святкавання календарна-абрадавых традыцыйных свят беларусаў залежаць ад фазаў руху Сонца і Месяца. Самымі заўважнымі і значнымі момантамі руху Сонца з'яўляюцца дні зімовага ды летняга соцаваротаў і веснавога ды асенняга раўнадзенстваў, якія падзяляюць гадавы цыкл на чатыры прыкладна аднолькавых перыяды – утвараюць сімвалічны «крыж». На гэтыя дні прыпадаюць вядомыя традыцыйныя беларускія святы. Даты гэтых свят у розных ступенях удакладняліся, рухаліся, падпарадкоўваліся ці ўтрымлівалі тэрміны традыцыйнага святкавання ў залежнасці ад гістарычных падзей і, галоўным чынам, ад удакладненняў календароў клерыкальнымі інстытутамі. На працягу другога тысячагоддзя менавіта хрысціянскія інстытуты вызначалі, захоўвалі і змянялі тэрміны свят і сістэмы летазчыслення. Аднак, хрысціянскія календары слушна захавалі ў сваім падмурку сістэмы дахрысціянскіх календароў, якія былі падпарадкаваны святам салярнага і месяцнага культу. Такім чынам узнікла падстава для працэсаў яднання традыцыйных (язычніцкіх, народных) і хрысціянскіх свят.

Мэта гэтага артыкула – акрэсліць праблематыку сучаснага святкавання вядомых свят беларусаў – Купалля і Русалля, – і вызначыць шляхі найбольш адэкватнай падрыхтоўкі, правядзення і асэнсавання іх святкавання прадстаўнікамі сацыякультурнай сферы краіны і саўдзельнікамі імпрэз.

Важна адзначыць відавочную тэндэнцыю ў сённяшнім грамадстве: святкаваць традыцыйныя, нацыянальныя святы не па канонам хрысціянскай святочнай абраднасці, а ў прывязцы да сучасных уяўленняў аб бытавых, грамадскіх формах святкавання. Такім чынам ўзікае пытанне як святкаваць Каляды, Багач, Вялікдзень ці Купалле ва ўмовах сучаснай клубнай сцэны, канцэртнай залі, фестываляў, паркаў (паркаў культуры і адпачынку) гарадскіх вулічных перфомансаў. Дадзены працэс уяўляецца актуальным таму, што фарміруе нацыянальна-культурную аснову сацыяльных і міжасобасных зносін. Актуальнасць прапанаванай тэмы грунтуецца на тым, што ў 2013 годзе святкаванне Вялікадня (Пасхі) адбудзецца 31 сакавіка (Грыгарыянская традыцыя) і 5 мая (Александрыйская традыцыя). Гэта вызначае, што свята Сёмухі (Троіцы) ў 2013 годзе, паводле Александрыйскай традыцыі, прыпадае на 23 чэрвеня, і «гранны», «русальны» тыдзень на якім адзначаецца традыцыйнае беларускае свята «Русалле» будзе доўжыцца з 23 па 30 чэрвеня. У сваю чаргу гэта вызначае наступнае: нетрадыцыйнае святкаванне Купалля ў ноч з 22 на 23 чэрвеня (дзень летняга санцавароту) якое пачалі актыўна святкаваць і прапагандаваць прыхільнікі фальклорнай абраднасці супадзе з Русаллем і з Троіцай. З пункту гледжання традыцыйнай абраднасці падобнае святкаванне выглядае дзіўным і недарэчным.

У сувязі з памылковай, але трывалай тэндэнцыяй да паступовага яднання і атаясамлівання абраднасці Русалля і Купалля, якая ўзнікла ў XX стагоддзі галоўным чынам ўсувязі з увядзеннем новага календара (Декрет о введении в Российской республике западноевропейского календаря 26.01.1918), неабходна заахвоціць абмяркаванне магчымасці мець штучна падрыхтаваны траспарэнтны варыянт захавання адрозных традыцый у адным «пашыраным» святочна-абрадавым комплексе, альбо ўзмацніць супрацьстаяніе вышэй ўзгаданай тэндэнцыі. Таму яшчэ раз звернемся да традыцыйнага вызначэння даты святкавання Купалля і Русалля.

Купалле традыцыйна святкавалася з 23 на 24 чэрвеня па Юліянскім календары ці з 6 на 7 ліпеня па сучасным, грыгарыянскім календары. Аналіз Купальскай абраднасці дазваляе ўпэўнена сцвярджаць, што свята было звязана і з сонцаваротам і з элептычным рухам Зямлі вакол Сонца. Грыгарыянскі календар ўдакладняў недахоп Юліянскага календара звязаны з рухам Зямлі вакол уласнай восі, аднак не ўлічваў прывязку пачатка і сярэдзіны году да кропак апагелія і перыгелія эліптычнага руху Зямлі, даты якіх за апошнія тысячагоддзі практычна незмяніліся.

Русалле традыцыйна святкавалася па сонечна-месяцавым календары ў час поўні (поўнага Месяцу) пасля Траецкіх (Сёмушных) дзядоў, цяпер Троіцы. Дата святкавання, гэтак-жа як і зараз, была рухомай. У сувязі з тым, што вызначэнне даты Пасхі ўлічвае месяцны календар, другая поўня пасля Пасхі звычайна (незаўсёды) прыпадае на першы тыдзень пасля Троіцы. Русалле слушна звязвываецца з самым моцным станам кветак, зёлак, лісця (сёмушы май) бо гэта час **поўні напярэдадні сонцавароту** (моманту памяншэння даўжыні дня, пачатку руху да заняпаду). У сувязі з прывязкай Тоіцы (Сёмухі) да рухомага тэрміна святкавання Пасхі (Вялікадня) і карыстання сонечным календаром, тэрмін святкавання Русалля стаў больш рухомым і цяпер таксама адзначаецца ў першы тыдзень пасля Троіцы, ці восьмы пасля Пасхі. Адрозныя варыяцыі даты і тэрміну святкавання Русалля (граной нядзелі, розгараў, провады) што адзначаюць этнографы, відавочна звязаны з складанасцямі, якія прынеслі календарныя змены і вызначынне даты Пасхі згодна Грыгарыянскай і Александрыйскай традыцый.

Праблема папулярызацыі беларускіх нацыянальных святочна-абрадавых комлексаў ў грунтоўна змяніўшымся, нетрадыцыйным, асяроддзі сучаснага горада застаецца вострай. У заходняй Еўропе гэты працэс меў больш лагоднае і натуральнае развіццё. Бытавое, грамадскае святкаванне Ражства, Дня св.Валенціна, Дня ўсіх святых (Хэлоўін) і іншых святочна-абрадавых коплексаў мела актыўнае побытавае развіццё. У тым ліку і атрыбутыка абрадаў, трансфармацыя святочна-абрадавых паводзін, музычнае аздабленне. У Беларусі (і іншых постсавецкіх краінах) побытавае, грамадскае адзначэнне традыцыйных свят Купалля, Русалля ва ўрбаністычных ўмовах немела развіцця. А ў вясковым, традыцыйным асяроддзі, было

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

саматужным і прыціскалася дзяржаўнымі інстытутамі. На фоне папулярызацыі атэізму, святары адрозных канфесій былі нездольны падтрымаць грамадскае, побытавае святкаване з улікам нацыянальных традыцый. Да таго, народныя формы святкавання ўспрымаліся як нехрысціянскія рудыменты паганства (Прыклад: артыкул Барбашова Е.Р. «Пережитки языческих культов…» Зборнік «Белевские чтения» выпуск II, -М., 2002).

У выніку сацыякультурных змен ў постсавецкім грамадстве адчуваецца жаданне аднавіць практыку побытавага (нецаркоўнага) святкавання нацыянальных святочна-абрадавых комплексаў ў тым ліку Купалля, Русалля ды іншых. Зразумела, Купалле і Русалле святкуецца беларусам, але апошнім часам дзякуючы апантанным энтузіастам, якія выязжаюць для ажыццяўлення гэтых мерапыемстваў з гарадскога асяроддзя «на прыроду» [1], ці спрабуюць ўтварыць рэканструкцыі святочна-абрадавых комплексаў (найбольш удалы прыклад святкавання Русалля на Любаншчыне вёска Нежын. [2]. Але ізноў, удзельнікі і публіка гэтых мерапрыемстваў складаецца з сацыяльнаактыўных, падрыхтаваных энтузіястаў, галоўным чынам навукоўцаў і фальклярыстаў, што ствараюць **рэканструкцыю**, а не сучасную форму побытавага, агульнанароднага святкавання.

Папулярызацыя сутнасці і ажыццяўленне святкавання абрадавых комплексаў Русалля, Купалля ў сучасных гарадскіх умовах (праз зразумелую, транспарэнтную легенду свята) з'яўляецца востраактуальнай, праблемнай задачай якая, патрабуе ад прадстаўнікоў сацыякультурнай сферы краіны, якія адказваюць за правядзенне свят, увагі да наступных аспектаў.

1. Неабходнасць якаснага інфарміравання аб тым, што Русалле і Купалле адрозныя святы. Яны маюць не толькі адрозныя назвы і тэрміны святкавання але і адрозны сэнс, абраднасць, атрыбутыку. Гэта важна адзначыць ў сувязі з тым, што папулярныя рускамоўныя інтэрнет крыніцы сцвярджаюць пра гамагеннасць гэтых святаў, ці пра «Русалле як адметную форму святкавання Купалля» [3] . На падставе якіх працягваецца массавае памылковае асэнсаванне традыцый.
2. Правядзенне перад святкаваннем грунтоўнага даследавання, з улікам таго, што тэрмін святкавання Русалля, Русальнага тыдня (Граной нядзелі, Сёмушных дзядоў) вызначаецца ад даты свяіткавання Вялікадня з улікам фазы месяца, а Купалле з'яўляецца святам толькі салярным (дзень найвялікшай адлегласці Зямлі ад Сонца, без уліку руху Месяца) і мае дакладную дату святкавання.
3. Звяртанне ўвагі арганізатараў свят на тое, што ў адрозненні ад Купалля, эратычная і забаўляльная абраднасць уласціва толькі для Русалля. У цэнтры абраднасці Русалля культ вады, цэнтры абраднасці Купалля культ агню. Абрад сімвалічнага ахвярадаўства у час Русалля – рацэ, у час Купалля – вогнішчу. Месца правядзення Русалля ў лагчыне, меца правядзення Купалля – на гарышчы і г.д.
4. Па магчымасці захаванне традыцыйнай даты святкавання Купалля – ноч з 6 на 7 ліпеня (сучасны календар). Святкаванне сонцавароту 22-23 чэрвеня разглядаць як новастворануюу традыцыю.
5. Фарміраванне сучаснай атрыбутыкі свят – касцюміравання (маскіравання), спеўна-музычнага кантэнту, святочна-сацыяльных паводзін з улікам трансфармацыі абраднасці. Асэнсаванне новых формаў трансляцыі легенды і аксіялогіі свята, рабіць з улікам страты актуальнасці земляробчага, сельскагаспадарчага календарнага цыклу.

**Спіс літаратуры:**


1. Купалье – 2012: где можно прыгнуть через костер и поискать «папараць-кветку»? [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.interfax.by/article/93018. – Дата доступа: 16.04.2013.
2. На Любаншчыне справілі Русалле. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://news.21.by/culture/2011/06/20/321152.html – Дата доступа: 16.04.2013.
3. Семик. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ru.wikipedia.org/wiki/семик – Дата доступа: 16.04.2013.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ